Кастрычнік 2019 – Надзвычайны місійны месяц

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
29.09.2019 00:00



З нагоды стагоддзя апублікавання папам Бенедыктам XV Апостальскага ліста “Maximum illud” – дакумента, які меў на мэце абудзіць у цэлым Касцёле свядомасць місійнага абавязку – Святы Айцец Францішак абвясціў кастрычнік бягучага года Надзвычайным місійным месяцам. Дэвізам былі абраны словы: “Ахрышчаныя і пасланыя: Касцёл Хрыста з місіяй у свеце”. Місіі – гэта тэма, якая датычыць усіх вернікаў. Кожны з нас павінен абудзіць у сэрцы жаданне абвяшчаць Евангелле і перамяняць сваю супольнасць у місійную і евангелізацыйную рэчаіснасць, памятаючы, што місіі з’яўляюцца “ўмілаваннем Езуса і любоўю да Яго люду”. † **Гэтая перамена павінна адбыцца праз…**

• асабістую сустрэчу з Езусам Хрыстом, дзякуючы Эўхарыстыі, чытанню Божага слова, асабістай і супольнаснай малітве,

• вывучэнне сведчанняў святых місіянераў, якія загінулі мучаніцкай смерцю,

• паглыбленне біблійнай, катэхетычнай, духоўнай і тэалагічнай фармацыі, што датычыць місій “ad gentes”,

• рэалізацыю любові ў форме падтрымкі вялікай справы місій “ad gentes” і хрысціянскай фармацыі ў Касцёлах, якія знаходзяцца ў найбольшай патрэбе.

Мы павінны сведчыць пра тое, што Бог добры, найперш уласнымі паводзінамі. З гэтага пачынаецца кожная малая і вялікая місія. Варта памятаць, што быць місіянерам – значыць клапаціцца пра бліжняга і адорваць іншых людзей надзеяй.

Малітва на Надзвычайны місійны месяц

Божа Ойча, Твой Адзінародны Сын, Езус Хрыстус, пасля ўваскрасення даручыў сваім вучням м